# Прамова Кісялёва

Дэлегат Беларусі напомніў, што прафашысцкі венгерскі ўрад устанавіў ваеннае супрацоўніцтва з гітлераўскай Германіяй яшчэ ў 1938 годзе. Венгрыя ў саюзе з Германіяй выступіла супроць Чэхаславакіі і Югаславіі і, нарэшце, напала на Савецкі Саюз, накіраваўшы на савецка-германскі фронт для барацьбы з Чырвонай Арміяй 17 дывізій, у тым ліку свае адборныя часці.

«Венгерскія войскі прынеслі многа гора і пакут народам Савецкага Саюза, якія падвергліся нападу, і, у прыватнасці, Беларусі,—гаворыць Кісялёў.—Яны ўстанавілі рэжым грабяжу і гвалту над мірнымі савецкімі грамадзянамі на часова акупіраваных тэрыторыях. Тым не менш, беларуская дэлегацыя лічыць, што Мірная канферэнцыя не павінна кіравацца пачуццём помсты да венгерскага народа. Мірная канферэнцыя не можа таксама не прыняць пад увагу, што Венгрыя парвала ўсе адносіны з Германіяй і 27 снежня 1944 года абвясціла ёй вайну. Савет міністраў замежных спраў улічыў гэтыя важныя акалічнасці ў прапанаваным ім на разгляд Мірнай канферэнцыі праекце мірнага дагавору з Венгрыяй».

Кранаючыся пытання аб перасяленні часткі венгерскага насельніцтва з Чэхаславакіі, Кісялёў указвае, што такая пастаноўка пытання зусім зразумела, паколькі венгерскае насельніцтва, якое жыве ў некаторых раёнах Чэхаславакіі, стварала ў мінулым усім вядомыя цяжкасці ва ўстанаўленні добрасуседскіх

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы